Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Год 1. Вильня 24 листопада (ноябра) / 7 грудня (дзекабра) 1906 г. № 3.

# Наша Нива

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА З РЫСУНКАМИ

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литэрами.

Адрэс рэдакціи и администраціи:

**Вильня, Большая Погулянка д. № 17.**

Падписка принимаецца и прадаюцца атдзельные нумэры газэты: 1) У Кант. „Нашай Нивы“—Бальшая Погулянка дом № 17 кв. 20. 2) У Книгарни „Знание“ — Георгиеуски проспэкт дом № 14. 3) У Книгарни Литоускай М. Пясэцкой — Шлапэлис, Доминиканская вулица дом № 13.

Цэна з перэсылкою и дастаукою да хаты: на 1 год—3 руб., на 6 месяцоу—1 руб. 50 кап., на 3 мес.—75 кап., на 1 мес.—25 кап. Без дастауки и перэсылки: на 1 год—2 р. 40 к., на 6 мес.—1 р., 20 к. на 3 мес.—60 кап., на 1 мес.—20 к. За границаю: на 1 год—4 руб., на 6 мес.—2 руб., на 3 мес.—1 руб. Перэмена адрэсу—20 кап.

Абъяуленния прымаюцца на паследняй страницы па 20 кап. за линейку малыми литэрами. Рукописы и корэспонденции, прысыланые у рэдакцию, мусяць быць чытэльна написаны з праудзиваю фамильеею и адрэсом таго, хто яе прысылае. Можна также падписаць прозвищэ разомъ з фамильею, кали незахочэце, каб была надрукавана ваша праудзивая фамилия. Адрэс и фамилия только для ведама рэдакции.

## *Ад Рэдакции.*

Нам кажуць, што шмат хто, каму мы паразсылали № № 1 и 2 „Нашей Нивы“, не палучыў их. Каб гэтаго не было и з чародными нумэрами „Н. Н.“, мы радзим, каб усе, хто хочэ палучаць нашу газэту, прыслали нам свае адрэсы. Хто не паспешыць зрабиць гэта, той № 4 не палучыць. Трэба шмат каму прыпомниць, што за газэту ўжо пара высылаць грошы.

Усих нашых прыяцелёў просим шырыць меж вёсковых людзей „Нашу Ниву“. Шукаем ешчэ агентоў па гарадох, мястэчкох и вёсках.

## НОЧКА.

Кольки дум ты мне навеяла,
Ночка цёмная мая;
Кольки слёз в душу пасеяла,
Кольки гора прынесла!
Цёмна ты, длинна, нявесела,
Так як жыццё мужыка...
Тольки хмароў панавесила —
З них дошч льецца, як рэка.

Вот кабы скончалась ночэнька,
Каб дзень светленьки настаў;
И каб на то мая моченька,
Гэтуб цёмнасць разагнаў.
Доўга, доўга людзям прыдзецца
Шчасця на зямли шукаць;
Не одна к нам ночка вернецца
Новы думки наганяць...

**З. К.**

*Вильня 24 листопада (ноября).*

Дзень сазыву новой Государственой Думы ўсё болей и болей приближаецца. Кали яна збярэцца — нима ведома, але гледзячы на тое, што цяперь робицца вакруг нас, як прыгатаўляюцца да выбороў усе, каму ёсць карысць або патреба, каб новая Дума была непадобна да першэй, — можна смела сказаць, што Дума збярэцца ўжо скора.

Прэдвыборная работа кипиць усюды. Расъясненне Сэната адабрали право падавання голасу на выборах ад многих тысячоў людзей, найбольш людзей працуючых. Сотни и тысячы их сядзиць па турмах або ў далёкай Сыбиры. Карыстаюць з гэтаго ўсе цёмные силы: чорные сотни растуць; силай, грашми ды гарэлкай збираюць яны голосы за своих дэпутатоў — ворагоў свету и свабоды народнай.

Видзим мы ўсё гэта и с трывогою поглядаем упярод, с трывогай кидаем пытанне: якая будзе новая Дума? Чы пасля таго, што пережыў народ за гэты год, изноў настане царство цемноты и сил цёмных и злых? И трывога наша мае прычыну. Газеты разнесли па ўсей Расеи весць нядобрую: Столыпин, глаўны министр, кажуць, заявиў, што Дума повинна быць паслушна правицельству, бо иначэй яе зноў разгоняць. А якаяж корысць з Думы, которая будзе бояцца смела сказаць праўду,—сказаць, чаго трэба народу? Чыж не для гэтаго яна збираецца?

Чы тольки жадання пана Столыпина споўняцца так лёгко?

— Гистория кажэ нам, што гэта не надта лёгкая рэч. Семдзесят шесць лет таму назад ва Франции было нешта падобнае да таго, што цяперь робицца у нас. Французскае правицельство распусцило тогды *парлямэнт* (тое што Гасуд. Дума) на пяць гадоў раней сроку и думало, што на новых выборах народ выбярэ депутатоў, паслушных воли правицельства. А выйшло саўсим ня тое: ў парлямэнт папало ешчэ болей людзей, каторые моцна стаяли за народ за свабоду....

Так само было у Пруссии: ў 1862 гаду сабраўся парлямэнт, каторы быў неугодны каралю прусскому Вильгельму I. И заседаў гэты парлямэнт ня доўга: праз тры месяцы яго разагнали. Але и новые выборы дали дэпутатоў ешчэ болей неугодных каралеўскому правицельству.

Вось и ешче адно: ў той самой Франции ў 1876 гаду прэзыдент французски Мак-Магон разагнаў парлямэнт и объявиў новые выборы. Але ведаў ён, што было раней у Прусии и Франции, ведаў, што без працы ня есци калачы, и пачаў усеми силами сваими дабивацца, каб народ выбраў тых дэпутатоў, которые хацело правицельство. Многа пайшло на гэта працы, многа грошэй и... ўсё дарма. Народ французски не паслухаў намовы и агитации свайго правицельства и выбраў з памеж сябе дэпутатоў, каторым верыў, што будуць шчыра служыць яму, народу, будуць цвёрда добивацца спаўнення воли паслаўшых их людзей.

Чыж народ наш горшы ад немецкаго або Французскаго? Чы нима у яго сил досыць? Чы так лёгка задурыць яму голаву што не распазнае Юдашоў ад братоў сваих? Не николи не! Свет науки, свет прауды папаў ужо и ў глухие куты нашаго цёмнаго краю, шырыцца ўсё болей и болей, як той пажар у леси: ня лёгка згасиць яго...

Цяперь трэба тольки, каб усе, хто хочэ исци па дарози к свету, праўдзи и свабодзи, сабрали у одно свае силы, каб злучылися разам, бо у грамадзи — сила. И трэба памятаць, што перамениць усё злое ў жыццю нашаго народу будуць старацца найболей тые, каму найгорш жывецца, хто гэта добра разумее и патрафиць зарадзиць бядзе сваим розумом. Багачы, памешчыки ды фабриканты нявельми церпяць беду ды горэ ад цяперашних парадкоў; найгорш жывецца працуючаму народу, таму народу, што апроч сваих рук да працы ничога немае. Дзеля таго найлепшыми, найсмялейшыми бойцами ў Думе за новые парадки будуць тые людзи, каторых працуючый народ выбярэ з памеж сябе або з памеж сваих шчырых, праўдзивых и верных прыяцелёў, што для яго працавали и цярпели за справу народную. Тольки тые перэмены, каторых яны дабьюцца, дадуць найбольшую свабоду ўсим людзям, што жывуць у Расеи, и не дазволяць, каб адны людзи панавали ды крыўдзили цемнейшых и беднейшых братоў сваих.

Нехай жэ знаюць гэта ўсе працуючые и ўсе, хто им спагадае, нехай выбираюць *сваих* депутатоў, бо иначэй чорные сотни и иншые вораги шчасця и свободы народнай запануюць над усим краем.

# З Беларуси и Литвы.

(ад нашых корэспондэнтоў).

Мяст. **Плешчэницы** (Борысоўскаго п. Менск. губ.). Жыцели мястэчка вядуць спор за рынак. Памешчыца Тышкевичовая дала кавалак земли для рынку за мястэчкам и збудовала им тры рады мурованных крамкоў. Бедные дробные торгоўцы прасили губернатора, каб астаўся стары рынак, гдзе ёсць ихния крамки. Просьба выслухана да часу.

У мястэчку будуецца цэрква, каторая згарэла у 1897 гаду. Будулец афяровала памешчыца Тышкевичовая.

М. **Хотаевичы** (Бор. у.). Тутака папраўляюць касцёл, што прастаяў закрыты каля 40 гадоў. Праваслаўны „прычт“ гэты час карыстаў з надта добрых касцельных зямель.

М. **Илья** (Вилейск. п.). Недаўно за „нарушэнне тишыны“ на вулицы стражник пачаў пьянаго мужыка угашчаць „зубочынами“. Пяць прахожых мужыкоў прасили стражника ня биць пьянаго, а аддаць па закону пад суд. За гэта ўсих шасцярых пасадзили у уездную турму.

**Логойск** (Бор. п.). Тутэйшы земски начальник надта сроги. Ен садзиць у халодную мужыкоў, што прыходзяць да яго прасиць рады. Адзин мужык з вёски Логозы зайшоў спытацца, як зрабиць прагон для быдла на пашу. Земски начальник не захацеў з им гаварыць. Тагды мужык запытаўся, на што ён, земски, служиць? Той стаў лаяцца, сам без шапки павёў мужыка ў халодную и сказаў: „цяперь будзеш знаць, зачэм я служу!“

У прошлую зиму памёрло шмат народу ад тыфусу. Цяперь тут наняли дохтора. Заразы нима.

М. **Гайна** (Бор. п.). У вёсках Зверыничы и Слобода ўжо каля трох месяцоў пануе тыфус. Наняты фэльчэр ня можэ хвароби даць рады. Пры Гайно-Слабодским валастным упраўленни будуецца новая турма. Да гэтуль земски начальник пасылаў на адсидку ў Логойск и Борысоў. Здарення такие бывали надта часта и ўсим надаели.

**Магилеу губ,** Месяцы тры таму назад у пана Казлоўскаго у Заходах вада знесла мельничны стаў. Возеро заливало мужыцкие сенажаци, и Казлоўски плациў за гэта заходским мужыком сто рублёў па угавору, зробленаму шмат гадоў таму назад. Цяпер, кали стаў знясло, мужыки патрэбовали ад Казлоўскаго ци саўсим не затапляць их сенажаци, ци набавиць цэну за яе, бо цяпер яна каштуе больш, як раней. Казлоўски не паслухаў и пачаў рабиць новы стаў. Тагды мужыки ўсей грамадой прыйшли да яго и разбурыли работу, а работникоў разагнали. Казлоўски пожалиўся губэрнатору, и той прыслаў спраўника з 22 стражниками.

Спраўник дапытаўся, хто бурыў стаў, прыказаў схапиць тых и высеч. Секли и старых, и маладых — хто тольки быў ля ставу. Папала и двум бабам, што надта галасили, як секли их дзядоў. Многа мужыкоў пахавалося па лясох и гэтым абаранилися ад нагаек. Кажуць, што иншым з мужыкоў нагайками павысекли вочы и паламали руки. Пад канец 8 пабитых мужыкоў арыштовали и павяли у Горки ў турму.

**Ч.**

— **Свислоч.** У нашэй Учицельской сэминарии учашчыеся запрэчыли процку парадку науки двох учыцелей, Цветкова и Сяменова. Дырэктор сэминарии ў той справе выехаў у Вильню, даць атчот з усей справы пану попячыцелю Виленскаго учебнаго вокруга.

Дзен. Вил.

**З Барысаускаго павету.** У Барысаускаго спрауника як нам пишуць Че.......... под весну сёлета издох казёл. Спрауник дау срочное паручэньне приставу Х........ву пакупиць у Лагойску для яго дзяцей пекнаго казла. Хр.....у за 6 руб. покупиу самаго лепшаго белаго козла и патрэбовау у старшыны П......ко фурманки. Старшына паручыу старосьце С......ху выслаць чародную фурманку. Чарод быу мужыка Киш...но, который без марудзтва падъехау пад хату пристава, гдзе кармили, мыли и чысцили козла. Киш..но на марозе чакау чатыры годзины, прымёрз и прогаладауся. А пристау тымчасам учыу казла дэликатне обходзицца са сваими будушчыми панами.

Киш...но паехау дамоу ня дочэкаушысь пасажыра — казла значыць, катораго адаслали на пачтовых. Пристау вызвау старшыну и старасту „на объясненьне“ злаяу их, прыгразиушы адправиць пад арэшт. Старшына и староста накинулись на беднаго Киш..но, каторый адкупиуся, угасціўшы сваё начальства; гэта каштавало яму сем рублёў.

**Мицкуны.** У концы прошлаго месяца (акцябра) у Виленском повеци на госцинцу каля мястэчка Мицкун было такое здарэнне: Пяць людзей з вёски

Ворняны тагож павету загнаушы плыты да Коуна места, ехали з грашыма до дому.

Як только яны подъехали да лесу, дык на них напали разбойники: Жоралович, Камар, Мялдун, чацвёртаго няуспомню ужо, казали им маучаць, но одзин з людей Ворнянских нешта сказау, тогды адзин з грабицелей дау яму калом у зубы и выбиу пяць; затым грабицели усих пачали бичь; збитых кинули на гасцинцу и уцякли.

Побитые, добраушысь да Мицкунской волосци, дали знаць аб гэтым. Стражники усех грабицелей арыштовали и у арыштованных знайшли усе грошы, хустачку у крыви и кол, которым били. Палиция, арыштуючы грабицелей, недозволила людзям разшчытацца з ними, патрымала кольки дзён и пусьцила на волю да суду, мусиць каб изноу разбивали подарожных; як чуу я, то ужо там были новые грабежы. Людзи тамошне цяпер просто бояцца ездзиць у ночы.

Ярчук Мицку скій.

# Аб усём па троху.

**Достаука хлеба для галадаючых.** Для тых месцоў. гдзе сёлета быў неураджай, правицельство мелося доставиць хлеб. Зрабиць хэта ўзяўся таварыш министра ўнутрэнных дзел Гурко. Заместа таго, каб закупиць хлеб у купцоў, што им таргуюць, Гурко нима ведама чаму без уселяких торгоў згаварыўся з неяким Лидвалем, каторы николи хлебом не тарговаў, каб той доставиў, дзесяць мильёноў пудоў хлеба для галодных губерний. Гэтаму Лидвалю Гурко даў задатку восемсот тысячоў рублёў (800,000). Тым часом Лидваль, узяўшы грошы, даставиў тольки 500 вагоноў хлеба и больш ничога, хоць мужыки и галадають. Чаму Гурко хацеў купиць хлеб ад Лидваля, што займаўся да гэтуль устройством тых месц, куды кожны ходзиць пехатой, — ня ведаем. Ведаем тольки адно, што ўжо навэт Савет Министроў ўзяўся за гэту справу, каб выясниць прычыну ашуканства и абъявиць яе ўсим.

**Крэсцьянски Банк** дастаў право пазычаць мужыкам грошы пад залог надзельной зямли.

**Новы Заем.** Француски министэр Жан-Жорэс заявиў, што расейскае правицельство хочэ зноў пазычыць грошы ад Франции и што з Расеи нрыежджаў уполномочэны для гэтаго Изволъски. Француски министр отказаў яму, што найлепей было-бы, каб аб гэтай справи пастановила Гасударственная Дума, и што ўся Франция без сагласу Думы ня хочэ даць для Расеи грошэй. На гэта Изволъски заявиў, што Думе да гэтаго ниякого дзела нима, а кали и новая Дума будзе такая, як першая, то и яна будзе распушчэна. Сев.-Зац.-Гол.

**Ешче аб Думе**. „Дзен. Вил.“ пишэ: глауны Министэр Столыпин у гутарцы з неяким панам П. А. сказаў, што ён разгониць кожную Думу, которая не дасць сваего сагласу на ўсе законы, устаноўленные правицельством без Думы, и будзе сазываць усё новые и новые Думы, пакуль не збярэцца паслушная яму. „Дума будзе такая якую я хачу мець“ — сказаў Столыпин.

Штож тагды будзе далей?

**Чорные сотни** у Одэси не даюць жыцця спакойным людзям. З дубинами ды нагайками ходзяць яны свабодна па улицах цэлыми „кумпаниями“ и бьюць усих, хто им не спадабаецца и хто можэ быць „крамольником“. Н даўно пабили моцна шмат людзей, меж ими многа студэнтоў. Чаму палиция дапусцила гэта—ёй адной ведамо.

**Расходы на полицию.** Расходы на полицию усё растуць и растуць. У 1880 гаду давалось 4 мильёна рублёу, за министра Плевэ дашли гэтые расходы до 27 мильёноў рублёў, у 1906 гаду на палицию было выдано больше як 30 мильёноў руб., а у наступаючым 1907 гаду, не гледзячы на цяперэшние цяжкие часы, дадуць палиции 50,540,244 руб. (пяцьдзесят мильёноў, пяцьсот сорок тысяч, двесьци сорак чатыры руб.)

Дзен. Вил.



ПАД СЦЕНАМИ ТУРМЫ. РЫСОВАУ ГРОТГЕР.

Кольки ўздохоў и слёз пад сценами турмы,
Кольки гора пад ней раздаецца....
Гдзесьци гинуць у ночы, средзь буры и цьмы;
Гэта скарга далёка несецца;
Хто сядзиць у турме, той ня слышэць—чуе
Слёзы жонки, дзяцей адзиноких;

И ён бедный над долей слёзы горкие лье
В падзямеллях, у ямах глыбоких.
Час такий уж настаў, што не мала людзей
Гине ў турмах и гнець свою спину;
Шкода гэтах бяздольных, шкода ихних дзяцей,
Шкода ўсих в гэту цяжку гадзину...

**З. К.**

**Артур Гротгер,** той, што нарысоваў памешчены у гэтым нумэру малюнок быў вяликим польским артыстом. Шмат пекных рысункоу ён нам аставиў, а найпякнейшые з них гэта сабранне рысункоў, што называются: Полёния, Литуания, Вайна; астатняя для нас найцикавшая — бо тут артыста паказываець як страшна бывае на вайне, кали людзи бываюць падобны да дзиких звяроу, и збыўшы усё для них святое грызуцца памежы сябе.

Ня уси людзи тое, што гаварыў Гротгер у сваих рысунках, зразумели — ня уси разумеюць яго и цяпер.

Памёр Гротгер саусим маладым, неразвиўшы сваих силоў — памёр, у бядзе, у цяжкой хваробе, бяз прыяцелёў, у чужой старонцы. Шкода той силы, силы Гротгера, што загасла так рана, не зрабиўшы усяго таго, што яна ешче магла зрабиць.

**Элька**.

# З усих старон.

**Варшава**. Выстрэлы ў патруль; нядаўно на Броварной улицы акаладочны Сиьцоў затрымаў неякаго прахожаго у палерыни и хацеў яго абревидоваць, той выняўшы рэвольвэр, выстрэлиў пяць разоў ў Синьцова и солдатоў, а сам з товарышэм сваим ўскочили ў дом № 14. Рэвизия усяго дому не знайшла их и никога подазрицельнаго, а тые виноватые уцякли праз паркан на другую вулицу.

Дзен. Вил.

**Екатерынославу.** На Казацкой вулицы збройные людзи напали на конвой и асвабадзили чатырох политычных арыштованых. И усе уцёкли.

(З телегр. Дзен. Вил.)

# Чорт.

## III.

Много расказаў чуў Михась пра чарцей. Знаў ен, што пъяных часто водзяць па леси чэрци. Знаў, што можна атхрыстицца, и яму было и страшна, и весела.

И от Михась, як яго хто падбіў, ўзяў и заґукаў на ўвесь лес:

— Чэрци, трасца вашый ґалаве, сюды идзице!

Эха паняслася па дарози, пашла па кругламу балоту к Белым Крыницам и сцихла кале Кирылавай Магилы.

Михась стаяў и слухаў, як яно гудзела.

И зноў ўсё стало цихо.

Блишчасты месяц, як кружок залаты, стаяў ўжо высока над лесам. Циха было ў густом бары закрыла низ цемнота. Ў Белых Крыницах нудна перакликалися совы. Далёка-далёка, як с пад зямли, данасіўся сабачы брэх.

И чуе Михась: нешта загрукатала па дарози. Прыслухаўся. Гук не сцихаў и быў ужо ближэй. Ўжо можна распазнаць, што нехта едзе. Кола билася аб карннэе и скрыпела.

Михась пасмялеў.

Гук и скрып калёс саўсим ужо близка.

Михась скинуў кажух, вывярнуў у верх шэрсць и накинуў на сябе. Ў шапку ваткнуў две палачки замиж рожак и прытуліўся пад хвояю.

Иван спаў, як забиты.

Падъехаў воз.

На вози ляжали мяхи з мукою, а на мяхох сядзеў мужык. То быў Пятрусь Гвоздзь, той самы Пятрусь, што летась украў у Михася з лесу тры возе. Пятрусь ехаў з млына; сядзеў ён на возе без шапки и маліўся Богу, едучы чэраз гэта страшнае месца.

## IV.

— Стой! Крыкнуў Михась, выскачыўшы с пад хвои и схапиўшы каня за вобруць.

Пятрусь так и абамлеў.

— Дык вот ён яки чорт! Гаварыў Михась:— ах, ты халера!

Пятрусь трохи апомниўся. К яму вярнуўся язык и памяць.

— Уцякай з дароги, бо канём раздушу!

— Як?! ты мяне з дароги гониш?

— Уцякай кажу, а то ешчэ нюхаўку сабью.

— Ты мне?! Да ты знаеш, хто я?

— Ну, хто ж ты?

— Ага! Хто я! Папрабуй выцяць.

Пятрусь ужо падняў пугу, але не асмелиўся выцяць „чорта“

— Ну, годзи! Пашоў з дароги!

— Не, не пайду!

— Чаго ты прывязаўся, як смала? Тьфу! Згинь, прападзи, нячыстая сила! Уцякай — хрысцицъ буду!

— Ну, перахрысци!

Зноў Пятруся страх ўзяў. А што, як крыж не паможэ? Тагды што?

Пакуль яны крычали, конь пачуў волю и стаў памаленьку заварачывацца назад, шчыпаючы траву. У сварцы Пятрусь саўсим не бачыў, што конь яго завярнуўся.

А Михась як падскочыць к Пятрусю ды як запишчыць! Ды так моцна, што аж Иван падняў голаву. А конь як раз шчыпаў траву кале Ивана. Як заварушыўся Иван, конь спудзиўся и паскакаў назад у млын.

— Га-га-га-га!.. Зарагатаў Михась (ен чуў, што чорт рагочэ, падмануўшы чалавека).

Пятрусь и ня думаў спыняць каня: скарэй бы ад гэтаго нячыстаго месца!

А як ен дзивиўся, як изноў прыехаў у млын!

А на заўтра Пятрусь Гвоздзь усим як у звон званiў, што бачыў чорта кале Кирызавай Магилы.

**К. Альбуцки.**

# НЕВИДЗИМЫЕ НАШЫ ВОРОГИ.

## III.

Да найпрасцей збудованных орґанизмоў, што цела их зроблена без усяких хитрасцей, належаць и плесени, низшые (прасцейшые) грыбки. Плесень нам усим добра знаёма. Часта яна знаходзицца на хлеби, сыру, мясе. Спачатку гэта цененькие, малюсенькие, нитачки, пасля тое, на чым развиваюцца пакрываюць як бы шэрсцью. Як ближэй прыгледзишся да гэтае плесени, то и пабачыш, што яна мае камелёк — нитачку, на которай ёсць галоўка. Ад низу нитачки — стволика идуць як бы карэньчики и яны пранизываюць той прадмет, на которым сидзиць плесень и з катораго яна цягне соки, патрэбные ей да яды — да жицця. Часам плесень з хлеба, з сыру, або так з чаго-кольвек выцягне мало ня ўсё, што падтрымаць можэ и нашы силы, — вось таким парадком адбярэ ад чалавека яго яду, которую чалавек для сябе прыгатаваў. Зробицца гэта так хитра, што чалавек и не агледзицца, як таки маленьки орґанизм — плесень — ашукае яго. Вось гэта и ёсць першы нявидзимы вораг наш, што так лоўка ваюе з нами.

Може хто з вас спытаецца мяне: чамуж плесень называеш ты нявидзимым ворагом чалавека, кали яна, пакрываючы што-кольвек, расцець як шэрсць, а шэрсць видаць добра и з близка и з далёка?

А во чаму. Трэба ведаць, як зроблено цела плесини. У сваим часи мы дамо нашым чытацелям рысунки плесни, а цяпер пакажем тольки, якую форму мае плесень, кали яе увяличыць у многа разоў. Форма будзе такая: там, гдзе на рысунку мы паставили литэру *a* — гэта нитачка — стволик — камелёк плесни; — гдзе литэра *в* — гэта карэньчыки плесни, каторые яна запушчае ў тое, на чым сядзиць — вось як и кожное расценне. Кареньчыки гэтые можна добра разглядзець праз микроскоп, аб каторым мы писали у другим нумэры „Нашай Нивы“. На нитачцы вы дагледзице галоўку, што пры ёй мы паставили на рысунку литэру *c*. Вот аб гэтой галоўцы я вам зараз раскажу.




Ўсе пэўне добра помняць, што кожнае расценне, як ападзе кветка, на тым месцы, гдзе кветка расла, — мае насенне. Так вот и ў галоўцы плесени ёсць яе насенне, тольки як яно высыпецца, ты яго простым вокам не догледзиш.

Насення гэты лётаюць у паветры, бо яны надта лёгкие — бытцам пух; як пападуць гдзе-кольвек на добрае для их месца, то и ўзойдуць, и ўжо як падрасце плесень, тогды тольки яе доглядзець можна.

Вось чаму и назваў я плесень нявидзимым ворагом.

Плесень расце ня тольки на тым, што не мае жыцця. Есць плесени, што точаць и жывые орґанизмы. Часта, примерам, на лисцях бульбы паяўляюцца плямки, которые видаць и простым вокам.

Кали цэлы кусцик пакрыецца гэтакими плямочками, нацъ вяне, а пасля засыхае; бульба уродзицца малая, а часам и саўсим яе ня будзе. Хворы кусцик заразиць и здаровы, бо насенне плесени пападзе и туды; и часта бывае, што цэлые паля бульбы марнуюцца и прападаюць.

(Далей будзе.)

**Элька.**

Рэдактор-Выдаўца **З. Вольски**.



# АБЪЯУЛЕННЯ.

## Суполка „Загляне сонцэ и у нашэ ваконцэ“ выдала пакуль што и прадае:

BIEŁARUSKI LEMENTAR abo pieršaja nawuka czytannia, cana 6 kapiejek.
PIERSZAJE CZYTANNIE DLA DZIETAK biełarusoû, napisała Ciotka, c. 6 kap.
БЕЛАРУСИ ЛЕМЭНТАР, або першая навука чытання, цана 6 кап.
ПЕРШАЕ ЧЫТАННЕ ДЛЯ ДЗЕТАК беларусаў. Написала Цйотка, цана 6 кап.

**УЗЯЛА НА СКЛАД И ПРАДАЕ:**

ВЯЗАНКА Янки Лучыны (Ивана Неслухоўскаго), цана 4 кап.
КАЗКИ. Выдаў А. К., цана 3 кап.

БЕЛАРУСКИЕ ПАЧТОВЫЕ ПИСУЛЬКИ;

Щчорсуны ў летко; Щчорсуны ў зимку; Пранцишэк Богушэвич (Мацей Бурачок) песьняр беларуски; Винцук Марцинкевич;—песняр беларуски; Мужыки спад Слуцка; Парабкова дворная хата; Дудар беларуски; Янка Лучына (Иван Неслухоўски)—песьняр беларуски; Вясковая баба с Трыбужкоў; Дом Тадэуша Косцюшки у Мэрэчоўшчыни. Цана кожнай 5 кап.

Ўсйо гэта можна купляць ў глаўным складзи ў Пецербургу, Васйлёў востроў, 4-та линия, № 45, кв. 16.

Хто купляе ў глаўным складзе ня менш як за поўрубель, той ня плациць за прасланне почтаю. Малые грошы можна высылаць пачтовыми марками.

ХУТКА ВЫЙДУЦЬ:

Гутарки аб неби и зямли.
Жалейка. Янука Купалы

Грошы просим высылаць на имя **В. Столыгвы.**


Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.